РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 СНЕЖНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 234 (30622)

**Другі дзень афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Алжыр пачаўся са знака павагі да гісторыі алжырскага народа. Беларускі лідар усклаў вянок да мемарыяльнага комплексу «Помнік славы і пакутніцтва», які з'яўляецца адным з сімвалаў барацьбы алжырцаў за незалежнасць і памяці аб ахвярах вайны з Францыяй (1954—1962 гг.). Таксама кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з экспазіцыяй Нацыянальнага музея пакутнікаў («Эль-Муджахід»), дзе наглядна прадэманстраваны барацьба і рэпрэсіі ў дачыненні да жыхароў Алжыра ў перыяд Вайны за незалежнасць.**



Фота БелТА.

Перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Алжыра Абдэльмаджыдам Тэбунам праходзілі на тэрыторыі палаца «Эль-Мурадыя» ў сталіцы краіны. Афіцыйнай частцы мерапрыемства папярэднічала цырымонія сустрэчы з выкананнем гімнаў дзвюх краін, удзелам роты ганаровай варты. Сімвалічна, што афіцыйны візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Алжыр праходзіць у год 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі.

# «АЛЖЫР — ГЭТА ГЛАБАЛЬНЫЯ ВАРОТЫ Ў АФРЫКУ»

## Акцэнт у перагаворах Аляксандра Лукашэнкі і Абдэльмаджыда Тэбуна быў зроблены на паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і рэалізацыі ўзаемавыгадных двухбаковых праектаў

СТАР. 2–3

ЯК ЗМЯНЯЕЦЦА АЛГАРЫТМ ПАВЫШЭННЯ АДПУСКНЫХ ЦЭН?



7

АДУКАЦЫЯ

## КУЗНЯ ПАТРЭБНЫХ КАДРАЎ

### Беларускаму дзяржаўнаму тэхналагічнаму ўніверсітэту спаўняецца 95 гадоў

Казаць аб шаноўным узросце паважанай ВНУ можна, калі толькі пералічваць яе заслугі. На самай справе там жыве маладосць — шумная, дзёрзкая, мэтанакіраваная. І кожны верасень, як толькі ва ўніверсітэт прыходзяць чарговыя першакурснікі, яго ўзрост быццам абнуляецца, а жыццё напаўняецца новымі сэнсамі.




СТАР. 11

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25234>

# «АЛЖЫР — ГЭТА ГЛАБАЛЬНЫЯ

**Акцэнт у перагаворах Аляксандра Лукашэнкі і Абдэльмаджыда Тэбуна быў зроблены і рэалізацыі ўзаемавыгадных**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па мясцовай традыцыі перагаворы кіраўнікоў дзяржаў у вузкім і пашыраным складах праходзілі ў закрытым фармаце без пратакольных заяў для СМІ. Прычым у вузкім складзе, у асабліва даверальным фармаце «адзін на адзін» сустрэча працягвалася больш за гадзіну, даўжэй, чым было запланавана. А ўвогуле першыя ў гісторыі дзвюх краін перагаворы лідараў доўжыліся чатыры з паловай гадзіны.

Заявы прагучалі ўжо па выніках сустрэчы. Акцэнт у перагаворах Аляксандра Лукашэнкі і Абдэльмаджыда Тэбуна быў зроблены на паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва і рэалізацыі ўзаемавыгадных двухбаковых праектаў. У цэнтры ўвагі — перспектывы паставак тэхнікі і кааперацыі, узаемадзеяння ў аграпрамысловым комплексе, медыцыне, адукацыі і гуманітарнай сферы ў цэлым.



Фота БелТА.

## ВЫЙСЦІ НА ПАЎМІЛЬЯРДНЫ ТАВАРААБАРОТ

Па выніках перагавораў з Абдэльмаджыдам Тэбунам Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь і Алжыр у бліжэйшыя год-два павінны выйсці на тавараабарот хаця б у паўмільярда долараў.

«З упэўненасцю магу канстатаваць, што перагаворы з маім калегам былі цалкам канкрэтныя. Мы абмеркавалі ўвесь двухбаковы парадак дня, а таксама актуальную міжнародную сітуацыю, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі ў заяве для СМІ.

**— У асноўным па ўсіх пытаннях міжнароднай павесткі нашы пазіцыі супадаюць. Нашы сённяшнія перагаворы, калі яны кагосьці хвалююць (а як я зразумеў са слоў Прэзідэнта, кагосьці яны хвалююць), абсалютна не накіраваны супраць трэціх краін. Мы вялі перагаворы ў раўнапраўным ключы ў інтарэсах нашых народаў».**

Беларускі лідар падкрэсліў, што Алжыр — глабальныя вароты ў Афрыку. «У гэтым наш прагматызм. Мы шмат аб чым перагаварылі. Але на вышэйшы ўзровень няма чаго цягнуць усе гэтыя пытанні. Два дні таму мы правялі тут цудоўны форум, на якім сустрэліся кіраўнікі нашых кампаній і карпарацый. Яны бачаць канкрэтныя пытанні і шмат аб чым дамовіліся. Закрытых тэм няма абсалютна. Гэта не толькі гуманітарныя пытанні, сельская гаспадарка, але і ваенна-прамысловы комплекс», — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтым плане Прэзідэнт Беларусі адзначыў: не з'яўляецца сакрэтам той факт, што Алжыр у асноўным валодае зброяй, тэхналогіі якой адыходзяць у савецкія часы і якая цяпер набываецца ў постсавецкіх краінах. «А ў плане рамонту і мадэрнізацыі гэтай зброі канкурэнтаў на постсавецкай прасторы сёння няма. Мы можам ужо не толькі мадэрнізаваць узбраенні, рамантаваць, але і выраблядь многія віды зброі самастойна», — заўважыў беларускі лідар.

«Што датычыцца машынабудавання (а Беларусь — машынабудаўнічая краіна), Прэзідэнт сказаў, што яны зацікаўлены ў будаўніцтве сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці трактароў і аўтамабіляў. Наша тэма. Мы гатовы тут працаваць. Канкурэнты наўрад ці ў нас будуць у плане цаны і якасці, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. — Мы

**У тэму**

# АД АПК ДА ВПК

**У якіх напрамках супрацоўніцтва зацікаўлены Беларусь і Алжыр**

Сумесная заява аб умацаванні адносін дружбы і партнёрства паміж Беларуссю і Алжырам падпісана кіраўнікамі дзяржаў Аляксандрам Лукашэнкам і Абдэльмаджыдам Тэбунам па выніках праведзеных афіцыйных перагавораў.

## «ГРОШЫ ЛЮБЯЦЬ ЦІШЫНЮ»

У прысутнасці лідараў краін падпісаны таксама шэраг дакументаў, галоўны з якіх — Дарожная карта па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Алжырам на перыяд 2026—2027 гадоў.

— Грошы любяць цішыню. Таму мы не будзем у дарожнай карце прапісваць канкрэтныя кантракты. Напэўна, гэта было б няправільна. Але асноўныя кірункі і замацаваных (хто за якія кірункі адказвае) у дарожнай карце трэба вызначыць. З канкрэтнымі тэрмінамі выканання, — сказаў журналістам **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю, сустаршыня беларуска-алжырскай міжурадавай камісіі Артур КАРПОВІЧ.**



Ён растлумачыў, што дарожная карта прымаецца на два гады, бо ў свеце ўсё хутка мяняецца:

— Напэўна, рабіць дарожную карту на пяць гадоў сэнсу вялікага няма. Яна павінна быць на бліжэйшую перспектыву.

Міністр адзначыў, што алжырцы — людзі ўсходнія, і часам тыя ці іншыя пытанні вырашаюцца няпроста.

— Але калі яны бачаць, што ты з адкрытай душой, адкрытым сэрцам, то тады і стаўленне да цябе адпаведнае. З любым міністрам у нас выбудоўваецца дыялог, прычым вельмі канкрэтны, — сказаў ён.

Ужо вызначана, што наступнае пасяджэнне міжурадавай камісіі пройдзе ў Мінску ў першай палове лютага 2026 года.

## «РЫНАК АЛЖЫРА ВЕЛІЗАРНЫ — ЁСЦЬ НАД ЧЫМ РАЗАМ ПРАЦАВАЦЬ»



**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Юрый ГОРЛАЎ** у гутарцы з журналістамі адзначыў узаемную зацікаўленасць Беларусі і Алжыра ў пастаўках харчовай прадукцыі. Для нашай краіны такая цікавасць ёсць, напрыклад, да імпарту экзатычнай садавіны. А ў частцы беларускага экспарту ёсць шырокая лінейка прадукцыі, якая запатрабавана на алжырскім рынку.

Перш за ўсё гаворка пра пастаўкі сухога абястлушчанага малака. Работа ў гэтым кірунку пачалася з 2024 года, тады ў Алжыр пайшлі першыя партыі гэтага тавару. Цяпер дасягнута дамоўленасць прадоўжыць продаж.

— У рамках візіту (Прэзідэнта Беларусі ў Алжыр. — **«Зв.»**) заключаны дагавор на пастаўку сухога абястлушчанага малака на суму больш за 1,5 мільёна долараў, — удакладніў міністр. — Алжыр у вялікіх колькасцях завозіць сухое абястлушчанае малако, сухое цэльнае малако (каля 350 тысяч тон сухога малака Алжыр завозіць), і з яго вырабляюць прадукты харчавання: цэльнае малако, ёгурты, сыры, розную наменклатуру прадукцыі. А мы сёлета прадалі (усяго на экспарт. —**«Зв.»**) 35 тысяч тон сухога абястлушчанага малака. Гэта значыць, рынак Алжыра вельмі велізарны, і нам ёсць над чым разам працаваць.

Больш за тое, абмяркоўваецца магчымасць стварэння сумесных прадпрыемстваў па перапрацоўцы малака. І для гэтага Беларусь наведаюць алжырскія спецыялісты.

— Мы запрасілі нашых калег у Беларусь, каб яны паглядзелі на вытворчасць нашых малочных прадуктаў і мы разам з імі вызначыліся з магчымым стварэннем сумес-

# ВАРОТЫ Ў АФРЫКУ»

**на паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва двухбаковых праектаў**

гатовы дзяліцца з вамі тэхналогіямі. Пад гэтыя тэхналогіі пастаўляць і разам вырабляць адпаведную тэхніку. І навучаць вашых людзей, калі трэба, гэтым тэхналогіям».

Паводле яго слоў, Алжыру, у прыватнасці, вельмі патрэбны беларуская сельскагаспадарчая тэхніка і сельгастэхналогіі, бо без гэтага немагчыма вырашыць пытанне харчовай бяспекі. Прэзідэнт адзначыў, што Алжыр цікавіць вытворчасць малочнай і мясной прадукцыі. «Гэта наша тэма. Мы заўсёды можам і пачалі ўжо супрацоўнічаць у гэтым плане», — падкрэсліў ён.

Яшчэ адзін перспектыўны кірунак — супрацоўніцтва ў адукацыі. Алжыр кожны год выпускае з ВНУ вялікую колькасць спецыялістаў, а ўрачы менавіта з гэтай краіны займаюць вельмі вялікую долю ў ліку медработнікаў у Францыі. «Гэтым усё сказана. Нездарма змагаліся з французскім каланіялізмам», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Алжыры добра памятаюць часы супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам і цяпер дэлегацыю з Беларусі прымаюць як добрых і надзейных сяброў.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што Алжыр за мінулыя гады зрабіў моцны рывок у сваім развіцці, атрымаў поспех па многіх кірунках. «Сюды імкнуцца ўсе. Вядома, Алжыр выбірае. Ён супрацоўнічае перш за ўсё з дзяржавамі, якія дружалюбныя да яго. Усе хочуць тут працаваць і працуюць ужо. Выдатныя адносіны ў Алжыра з Іспаніяй, Германіяй, Італіяй, — адзначыў Прэзідэнт. — Таму я так засумняваўся, думаю: дзе ж наша месца ў Алжыры? Калі Прэзідэнт працягнуў расказ, я зразумеў, што мы заўсёды ў сваіх сяброў можам знайсці месца для працы».

## РЭАЛІЗАВАЦЬ ТРОХБАКОВЫ ПРАЕКТ З АМАНАМ

Па словах беларускага лідара, яго прыемна здзівіла тое, што ў Прэзідэнта Алжыра выдатныя адносіны з Султанам Амана і гэтай дзяржавай. «Яны вельмі цесна супрацоўнічаюць, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта нашы сябры. Мы з Султанам Амана 20 гадоў ведаем адзін аднаго. І, як многія заўважылі, у нас добрыя адносіны. З'явілася вельмі цікавая тэма. Прэзідэнт сказаў, што ў бліжэйшы час у яго фасфатаў будзе столькі, што не будзе куды дзяваць. А мы ўмеем вырабляць фосфарныя ўгнаенні. Мы вырабляем вялікую колькасць азотных угнаенняў. Алжыр, напрыклад, — гэта краіна, якая займае лідзіруючыя пазіцыі па здабычы і экспарце прыроднага газу. Краіна, якая ўваходзіць у ОПЕК (Арганізацыю краін — экспарцёраў нафты. — **«Зв».**). Значыць, вырабляе вялізную колькасць нафты. А калі ёсць газ, значыць, ёсць азотнае ўгнаенне».

У Беларусі вялікая колькасць калійных угнаенняў.

**«І калі з'явяцца ўласныя фасфаты (у Алжыры. — «Зв».), з іх можна і трэба рабіць угнаенні, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы па ўсіх пазіцыях мінеральных угнаенняў маем тэхналогіі. Мы можам у тым жа Амане (гэта скрыжаванне ўсіх гандлёвых шляхоў) пабудаваць на траіх, як я сказаў Прэзідэнту, прадпрыемства. Праінвесціраваўшы, пабудаваць прадпрыемства па вядомых тэхналогіях. Вырабляць вялікую колькасць мінеральных угнаенняў, якія патрэбны і ў Алжыры, і ў гэтым рэгіёне, асабліва ў Афрыцы».**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў актуальнасць гэтага пытання ў сувязі з неабходнасцю вырашэння праблемы голаду ў шэрагу краін і гарантавання харчовай бяспекі на Афрыканскім кантыненце. «Без угнаенняў і тэхналогій гэта немагчыма, таму гэта наша тэма. І ў дадзеным напрамку мы можам цудоўна супрацоўнічаць», — упэўнены беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка на перагаворах запрасіў прадстаўнікоў Алжыра прыязджаць у Беларусь, каб вывучыць існуючыя магчымасці. «Дзверы адчынены для алжырцаў як надзейных, добрых нашых сяброў, — запэўніў кіраўнік дзяржавы. — Калі вам нешта падыдзе і спадабаецца, мы гатовы з вамі супрацоўнічаць. Але не так, як некалі каланіялісты.

**Мы гатовы супрацоўнічаць як з сябрамі, блізкімі людзьмі. 47 мільёнаў чалавек, велізарная краіна з найвялікшым патэнцыялам. Тут трэба працаваць. Мы шмат аб чым дамовіліся. І гэта не пачатак. Мы выводзім нашы адносіны на больш высокі ўзровень. А далей яшчэ нямала зробім».**

## ПАДПІСАНА ДАРОЖНАЯ КАРТА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Абдэльмаджыд Тэбун таксама расказаў аб выніках перагавораў: «Мы ацанілі нашы крокі ў ходзе двухбаковых адносін. Гаварылі аб асноўных пытаннях, абмеркавалі наш план на 2026—2027 гады. Мы дамовіліся падтрымліваць інвестыцыі ў сферах сельскай гаспадаркі, машынабудавання, фармацэўтыкі, навуковых даследаванняў. Нашы міністры абмяркавалі ўсе пытанні па гандлі».

Прэзідэнт Алжыра адзначыў перспектывы росту тавараабароту паміж дзвюма краінамі. Абдэльмаджыд Тэбун заявіў, што падчас перагавораў прэзідэнты таксама абмеркавалі шэраг міжнародных пытанняў, у тым ліку адносна сітуацыі ў Палесціне і Лівіі. Абмяркоўвалася таксама тэма вырашэння канфлікту ва Украіне. Кіраўнікі дзяржаў сышліся ў меркаванні, што яго неабходна вырашыць мірным шляхам з дапамогай перагавораў.

Па выніках праведзеных афіцыйных перагавораў кіраўнікамі дзяржаў падпісана сумесная заява аб умацаванні адносін дружбы і партнёрства паміж Беларуссю і Алжырам. У прысутнасці лідараў краін таксама падпісаны шэраг дакументаў, галоўны з якіх — Дарожная карта па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Алжырам на перыяд 2026—2027 гадоў.

Заключаны пагадненні аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве, супрацоўніцтве ў галіне аховы здароўя жывёл, навуковых даследаванняў, тэхналагічнага развіцця і інавацый. На ўзроўні профільных ведамстваў падпісаны мемарандумы аб узаемаразуменні ў сферы супрацоўніцтва ў праваой сферы, у галіне навуковых даследаванняў і развіцця галін прамысловасці, у галіне сельскай гаспадаркі, у сферы прадпрымальніцтва і інавацый, у галіне вышэйшай адукацыі. Акрамя таго, заключаны мемарандум аб узаемаразуменні ў галіне акрэдытацыі паміж Беларускім дзяржаўным цэнтрам акрэдытацыі і ALGERAC.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта і БелТА.**

нага прадпрыемства, якое можа з'яўляцца адпаведным хабам для рэалізацыі ў тым ліку сумеснай прадукцыі на рынкі афрыканскіх дзяржаў, — адзначыў кіраўнік Мінсельгасхарча.

Акрамя таго, у рамках візіту ў Алжыр кіраўніка беларускай дзяржавы падпісаны ветэрынарны сертыфікат на рэалізацыю сухога дзіцячага харчавання прадпрыемства «Беллакт».

Ёсць дамоўленасць аб тым, што бліжэйшым часам Беларусь наведаюць спецыялісты з Алжыра, каб пацвердзіць халяльны сертыфікат на прадукцыю мяса-малочнай галіны краіны, які раней быў выдадзены арганізацыяй «БелХаляль».

Беларусь таксама прапанавала алжырскаму боку свае варыянты будаўніцтва малочна-таварных комплексаў з улікам мясцовага клімату.

## ПАТЭНЦЫЯЛ СУПРАЦОЎНІЦТВА МАЕЦЦА



Таксама падчас візіту вызначаны патэнцыяльныя праекты па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве. Пра гэта расказаў журналістам **старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Дзмітрый ПАНТУС.**

— У рамках афіцыйнага візіту кіраўніка дзяржавы падпісана пагадненне аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі. У найбліжэйшы час пачне функцыянаваць камісія па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве. У дадзены момант мы праводзім адпаведныя кансультацыі. За апошні час мы правялі досыць вялікую работу з нашымі калегамі з Алжыра ў частцы вызначэння патэнцыяльных праектаў па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве. На сёння сфарміраваны праект дарожнай карты, па якім мы ў хуткім часе распачнём яе практычную рэалізацыю, — расказаў кіраўнік Дзяржкамваенпрама.

Ён удакладніў, што ў дадзеным выпадку гаворка таксама ідзе аб лакалізацыі ў Алжыры патэнцыяльнай вытворчасці таго ці іншага віду прадукцыі:

— Алжырскі бок выстаўляе такія патрабаванні. Мы да гэтага гатовы, гэтыя пытанні сёння абмяркоўваюцца.

## РАЗВІВАЦЦА І ІСЦІ НАПЕРАД!



Што датычыцца прамысловасці, то ў супрацоўніцтве з Алжырам гаворка перш за ўсё ідзе аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў, лічыць **міністр прамысловасці Беларусі Андрэй КУЗНЯЦОЎ.**

— Мы дамовіліся з міністрам прамысловасці Алжыра развіваць супрацоўніцтва шляхам перадачы тэхналогій, стварэння сумесных прадпрыемстваў. Рынак для нашай прадукцыі абсалютна новы. Але мы вызначыліся па тых кампаніях, з якімі будзем супрацоўнічаць. З нашага боку гэта «Бабруйскаграмаш», «Амкадор», МАЗ, МТЗ. Прагаварылі пытанне, што тут ёсць тэма і нашага БЕЛАЗа, — сказаў міністр.

Гаворка ідзе перш за ўсё аб стварэнні сумесных вытворчасцяў.

— Мы толькі і казалі пра тое, што праз сумесныя вытворчасці мы атрымаем патрэбны вынік для нашых краін і зможам нарасціць тавараабарот, — заявіў Андрэй Кузняцоў.

Ён расказаў, што на 2026 год падпісаны Пратакол па лініі «Амкадора» адносна абсталявання для захоўвання збожжа на суму ў раёне 1 мільёна долараў.

Падпісаны таксама мемарандум па МАЗ на 300 аўтобусаў мадэлі 203.

— Гэта па 100 аўтобусаў у 2026 годзе, 2027-м і 2028-м з наступным выхадам вытворчасці да 200 машын у год, — растлумачыў міністр.

Вызначана таксама партнёрскае прадпрыемства з алжырскага боку для супрацоўніцтва з МТЗ. Запланавана серыя ўзаемных візітаў спецыялістаў, каб яны прадметна абмеркавалі ўсе дэталі ўзаемадзеяння.

— Тут неабходны трактары магутнасцю 90 і вышэй конскіх сіл, таму што яны збіраюцца асвойваць паўднёвую частку Афрыкі, дзе глеба значна складаней. У іх ёсць сумесныя вытворчасці менш магутных трактароў. А ў нас ёсць кампетэнцыі і магчымасці (па вытворчасці трактароў большай магутнасці. — **«Зв.»**), і мы бачым гэты рынак для асваення, — удакладніў міністр прамысловасці.

Па лініі «Бабруйскаграмаша» таксама вызначаны перспектывы сумеснай работы.

— Ужо ў студзені-лютым 2026 года плануюцца пастаўкі машынакамплектаў прэс-падборшчыкаў для таго, каб яны тут вырабілі, сертыфікавалі і мы мелі допуск на гэты рынак, — расказаў Андрэй Кузняцоў.

Адказваючы на ўдакладняючае пытанне, ці не перашкодзіць гэтым планам канкурэнцыя на алжырскім рынку, ён сказаў:

— Вельмі шмат канкурэнтаў. Але мы будзем прапаноўваць іншую лінейку, каб не канкурыраваць, не перасякацца і не дэмпінгаваць адзін аднаго, а развівацца і ісці наперад.

**Па матэрыялах БелТА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона:
**ЗАО «Оценка Сервис»**, УНП 491382947
Продавец: **ОАО «Гомельский литейный завод «ЦЕНТРОЛИТ»**,
246647, г. Гомель, ул. Барыкина, 240

**Торги состоятся 12 января 2026 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка с НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Компрессор К250-61-1 в комплекте с электродвигателем, (инв. № 2027). Адрес расположения: г. Гомель, ул. Барыкина, 240** | **57 960,00** | 5 796,00 |

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. +375 (44) 544-38-37 (Титков Виктор Семенович).**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) %.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ЗАО «Оценка Сервис»):** р/с BY94 BPSB 3012 3353 2001 9933 0000, в ОАО «Сбер Банк» г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 491382947, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 04 декабря 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 09 января 2026 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить вознаграждение в размере **6 %** от цены продажи, возместить затраты по газете в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи не позднее **20 (двадцати) календарных дней** со дня проведения торгов; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи не позднее **30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов.

Подробный перечень имущества, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by** в разделе Аукционы-«Очные торги».

Проводится аукцион в соответствии с Положением ЗАО «Оценка Сервис» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права заключения договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89. E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

---

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета**
проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**Здание кухни-столовой с подвалом и террасой, инженерные сети, объекты благоустройства по ул. Красноармейской, 48 г.п. Россь, Русский с/с, Волковысский район**

Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин
Размер задатка – 1 базовая величина

**Аукцион состоится – 15.12.2025 в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе –
**09.12.2025 до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03;
в городе Гродно: 8 (0152) 62 39 24, 62 39 31, 62 39 23.

Дополнительная информация размещена на сайте:
**https://au.nca.by**

УНП 500042135

---

## ОБ ОТМЕНЕ ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по административно-торговым помещениям в составе объекта «Возведение общежития квартирного типа по ул. Алибегова в г. Минске»**

Коммунальное унитарное дочернее предприятие
«Управление капитального строительства Запад»
информирует об отмене проектной декларации
и изменений к ней по административно-торговым помещениям
в составе объекта
«**Возведение общежития квартирного типа
по ул. Алибегова в г. Минске**»,
*опубликованным в газете «Звязда» от 22.03.2025 № 57 (30445),
от 28.05.2025 № 101 (30489),
от 10.10.2025 № 196 (30584), от 28.11.2025 № 230 (30618).*

УНП 192400611

---

АКТУАЛЬНА

# ВАЖНЫ АБ'ЕКТ ДЛЯ СУДОВАЙ СІСТЭМЫ

## У Мінску адкрылі будынак Апеляцыйнага эканамічнага суда



Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця аб'екта, што адбылася напярэдадні Дня юрыста, прыняў удзел Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН. Кіраўнік урада адзначыў, што будынак добра ўпісаўся ў архітэктуру Мінска, ён служыць знакавым месцам, упрыгажэннем сталіцы. «Для ўрада вельмі важнае завяршэнне нашай судовай рэформы — стварэнне Апеляцыйнага эканамічнага суда, таму што ў эканоміцы ўсё няпроста і бываюць няпростыя адносіны паміж суб'ектамі гаспадарання. Гэта судовая інстанцыя, я ўпэўнены, дапаможа ў тым ліку і нам вырашаць цэлы шэраг праблем, рабіць гэта хутка і якасна», — сказаў Прэм'ер-міністр.




Мэта стварэння Апеляцыйнага эканамічнага суда — вывесці апеляцыйную інстанцыю з эканамічных судоў абласцей і сталіцы, каб працэс перагляду судовых пастаноў па эканамічных справах судом другой інстанцыі стаў больш аб'ектыўным і якасным. Так, абласныя эканамічныя суды і эканамічны суд горада Мінска будуць выступаюць у якасці судоў першай інстанцыі, Апеляцыйны эканамічны суд — у якасці другой, апеляцыйнай, інстанцыі.

**Старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін СУКАЛА** адзначыў, што падрыхтоўка гэтага аб'екта была пад пастаянным кантролем Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. «Пачаткам работы новага суда мы завяршаем трэці этап судова-прававой рэформы. Таму гэта вельмі важны аб'ект для судовай сістэмы, для краіны. Кодэкс грамадзянскага судаводства, які ўступае ў сілу з 1 студзеня, аб'ядноўвае судовыя працэдуры эканамічнага і агульнага правасуддзя. Для гэтага быў неабходны новы суд. Да цяперашняга часу эканамічныя абласныя суды былі судамі адразу дзвюх інстанцый: суд першай інстанцыі разглядаў эканамічныя справы, і ён жа разглядаў скаргі на рашэнні, якія ўжо адбыліся. Такім чынам парушаўся класічны прынцып правасуддзя: «адзін суд — адна інстанцыя». Для якасці эканамічнага правасуддзя, для павышэння яго аўтарытэту, даверу да яго ў ходзе судовай рэформы было прынята рашэнне аб тым, каб стварыць асобны орган».

**Указ «Аб утварэнні Апеляцыйнага эканамічнага суда» быў падпісаны кіраўніком дзяржавы 3 красавіка 2025 года. У сваю чаргу, 27 кастрычніка 2025 года Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 381 сфарміраваны кадравы склад судзейскага корпуса Апеляцыйнага эканамічнага суда. Усяго ў ім — 27 суддзяў, уключаючы старшыню і яго намеснікаў. Утварэнне Апеляцыйнага эканамічнага суда стала завяршальным этапам судовай рэформы ў Беларусі. Так, у эканамічным правасуддзі краіны ствараецца паўнавартасная трохзвенавая сістэма судоў.**

Апеляцыйны эканамічны суд унікальны з пункту гледжання камунікацый, сучасных магчымасцяў, укаранення інструментаў лічбавага правасуддзя, заўважыў Валянцін Сукала. Хоць суд адзін і знаходзіцца ў Мінску, прынцып даступнасці правасуддзя парушацца не будзе: «75 % ад усіх апеляцыйных скаргаў прыпадае на мінскія гарадскі і абласныя эканамічныя суды. Што датычыцца іншых абласцей, то ў гэтым судзе створаны ўсе магчымасці для таго, каб у рэжыме анлайн весці судовыя працэсы і разглядаць пытанні без якіх бакоў».

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Вольга ЧУПРЫС** звярнула ўвагу на тое, што стварэнне новага судовага органа прадугледжвала і яго размяшчэнне: «Кіраўнік дзяржавы шмат увагі ўдзяліў таму, што неабходна не проста якаснае судаводства, але і зручнае размяшчэнне суда. Трэба, каб гэты аб'ект стаў месцам прыцягнення як работнікаў судоў, так і нашых грамадзян. Кіраўнік дзяржавы абазначыў, што нам неабходна месца, якое знаходзілася б у гістарычнай частцы горада, яно не павінна было будавацца з нуля, а павінна абапірацца на тую гісторыю, якую мы маем. І ў гэтым месцы сапраўды быў будынак, які патрабаваў рамонту».



**Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** падкрэсліў, што ўсе датычныя да будаўніцтва аб'екта працавалі ў адзіным парыве, разумеючы, што работу трэба выканаць у тэрмін і якасна. «Гэта атрымалася. Мы разам зрабілі вялікую справу», — рэзюмаваў мэр Мінска.

Апеляцыйны эканамічны суд у статусе працэсуальнага органа пачне сваю работу з 1 студзеня 2026 года, гэта значыць, з даты ўступлення ў сілу Кодэкса грамадзянскага судаводства.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

НА КАНТРОЛІ

# КАБ ЛЮДЗІ ЖЫЛІ ГОДНА

## У Бешанковіцкім раёне ёсць прадпрыемствы, якія паспяхова развіваюцца

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА працавала ўчора на Віцебшчыне. У цэнтры ўвагі спікера — актуальныя пытанні развіцця Бешанковіцкага раёна.

У прыватнасці, Наталля Качанава азнаёмілася з перспектыўнымі кірункамі дзейнасці ТАА «Скорпіа-Кветка». Прадпрыемства рэалізоўвае праект па стварэнні цэха па вытворчасці араматызатараў у рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект». Сёлета аб'ём прадукцыі прадпрыемства вырас амаль у два разы. Аб'ём інвестыцый — каля 700 тысяч рублёў.

Акрамя таго, Старшыня Савета Рэспублікі наведала цукерачную фабрыку ТАА «Люфтэр», якая забяспечвае значны аб'ём экспартнай прадукцыі ў Бешанковіцкім раёне. За 10 месяцаў бягучага года экспарт па прадпрыемстве склаў больш за мільён долараў ЗША.



Фота БелТА.

Фабрыка па вытворчасці цукерак у Бешанковічах таксама створана ў рамках рэалізацыі праграмы «Адзін раён — адзін праект».

Наталля Качанава азнаёмілася з прадукцыяй прадпрыемства, пацікавілася ўмовамі працы супрацоўнікаў. «Каб людзі жылі, працавалі, атрымлівалі дастойную заработную плату і мелі добрыя ўмовы для жыцця, патрэбны вось такія прадпрыемствы», — лічыць спікер.

У размове з журналістамі Наталля Качанава адзначыла: «Цяпер, калі абмяркоўваецца Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця, якая хутка будзе прымацца на Усебеларускім народным сходзе, вядома, ключавое месца адводзіцца развіццю рэгіёнаў». Яна заўважыла, што развіццё рэгіёнаў было прыярытэтным кірункам у цяперашняй пяцігодцы, такім жа застанецца і ў наступнай».

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ І НАДЗЕЙНАЯ ЧЫГУНКА

## Дэпутаты прынялі шэраг законапраектаў

Завершаны разгляд бюджэтна-падатковага пакета дакументаў на 2026 год, удасканальваюцца грамадскія адносіны ў галіне чыгуначнага транспарту, павышаецца транспартная бяспека, пашыраецца ўзаемадзеянне ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, узмацняецца супрацоўніцтва Беларусі з іншымі краінамі.

### САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ І СПРАВЯДЛІВЫЯ ПАДАТКІ

Згодна з праектам Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2026 год», разгледжаным у другім чытанні, даходы на будучы год прадугледжваюцца ў суме 54 384,3 млн рублёў. Асноўныя крыніцы падатковых даходаў рэспубліканскага бюджэту — падатак на дабаўленую вартасць, акцызы, падатковыя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці.

Расходы рэспубліканскага бюджэту на 2026 год сфарміраваны ў суме 58 733,2 млн рублёў. Захоўваецца сацыяльная накіраванасць расходаў бюджэту. У прыярытэце — фінансаванне адукацыі і аховы здароўя, рэалізацыя мер, накіраваных на павышэнне якасці жыцця насельніцтва, падтрымку шматдзетных сем'яў. Значную частку ў бюджэце складуць выдаткі на аплату працы, пенсій, стыпендый, дапамог. Фарміраванне рэспубліканскага бюджэту на 2026 год праведзена з дэфіцытам у памеры 4348,9 млн рублёў.

Законапраектам «Аб змяненні законаў па пытаннях падатковых праваадносін» зменены стаўкі па павышаным падаткаабкладанні даходаў грамадзян. Стаўка падаходнага падатку ў адносінах да працоўных і іншых даходаў складзе:



Фота БелТА.

13 % для даходаў у памеры да 350 тысяч рублёў; 25 % для даходаў у памеры звыш 350 тысяч рублёў, але не больш за 600 тысяч рублёў; 30 % для даходаў у памеры звыш 600 тысяч рублёў.

Як адзначыў **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ**, інвестараў, якія ўкладвалі грошы ў нашу краіну, у бізнес-праекты, гэта змяненне не закране. У адносінах да дывідэндаў стаўка падаходнага падатку складзе 13 % для даходаў у памеры да 350 тысяч рублёў і 25 % для даходаў у памеры звыш 350 тысяч рублёў.

Што датычыцца дэфіцыту, з якім прадугледжана выкананне рэспубліканскага бюджэту на будучы год, па словах Юрыя Селівёрстава, наяўнасць разумнага ўзроўню дэфіцыту не з'яўляецца праблемай. «Мы ў рамках параметраў гэта забяспечваем, — удакладніў ён. — Будзем працаваць. Можа, добра спрацуе эканоміка — атрымаем добрыя даходы, і дэфіцыту не будзе».

### ЯКАСЦЬ ПАСЛУГ І БЯСПЕКА РУХУ

У першым чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях чыгуначнага транспарту». Замацоўваюцца паўнамоцтвы ўрада на ўстанаўленне парадку закрыцця малаінтэнсіўных чыгуначных ліній (участкаў), а таксама аднаўлення руху па іх. Размяжоўваецца кампетэнцыя Міністэрства транспарту і камунікацый і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях пры ажыццяўленні дзяржаўнага кантролю (нагляду) у галіне чыгуначнага транспарту.

«Замацоўваецца абавязак уладальніка чыгуначных шляхоў неагульнага карыстання па фіксаванні і інфармаванні кампетэнтнага органа (Транспартнай інспекцыі Мінсктранса) аб фактах парушэння бяспекі руху і правіл эксплуатацыі чыгуначных шляхоў, — звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў Юрый ПАНФІЛАЎ**. — Пашыраецца пералік асоб, якія ў абавязковым парадку павінны праходзіць медыцынскі агляд, пераагляд і тэхнічнае навучанне. Удакладняюцца ўмовы давання права кіравання транспартнымі сродкамі чыгуначнага транспарту. Замацоўваецца норма па аказанні сітуацыйнай дапамогі інвалідам на вакзальных комплексах».

Па словах дэпутата, галоўная мэта законапраекта — стварэнне ўмоў для забеспячэння стабільнай і надзейнай работы чыгуначнай галіны, павышэнне якасці паслуг і гарантаванне бяспекі руху на чыгуначным транспарце.

Парламентарыямі ратыфікаваны таксама шэраг міжнародных дакументаў.

**Вераніка КАНЮТА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | УП «Лаздуны-Агро», Гродненская обл., Ивьевский р-н, Лаздунский с/с, аг. Лаздуны 1, ул. Советская, д. 1. УНП 592001055 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф.1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов**

| Лот № | Наименование лота | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 СК-4 6029, 2011 г. в.** | **66 554,24** |
| 2 | **Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 0148 СВ-4, 2009 г. в.** | **66 012,53** |
| 3 | **Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 3358 СВ-4, 2010 г. в.** | **66 453,73** |
| 4 | **Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 3377 СВ-4, 2009 г. в.** | **66 207,66** |
| 5 | **Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 СК-4 6030, 2011 г. в.** | **66 554,24** |
| 6 | **Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 2472 СВ-4, 2010 г. в.** | **66 427,46** |
| 7 | **Автомобиль МАЗ 555142, АК 7602-4, 2007 г. в.** | **9 683,23** |
| 8 | **Культиватор КРН -5,6А, 2011 г. в.** | **2 976,93** |
| 9 | **Автобус ПАЗ 32050, AI 6925-4, 2002 г. в.** | **4 846,88** |
| 10 | **Автомобиль Богдан 231010-31 АЕ 4848-4, 2011 г. в.** | **3 023,02** |
| 11 | **Измельчитель-смеситель раздатчик кормов ИСРК-12, 2011 г. в.** | **4 497,94** |
| 12 | **Сеялка точного высева PLANTER3N, 2013 г. в.** | **17 840,86** |
| 13 | **Трактор «Беларус» 3522 СК-4 6027, 2011 г. в.** | **75 305,84** |

Шаг торгов – 5 % от текущей цены лота.
Цены снижены по лотам № 1 – 12 – на 25 %,
по лоту № 13 – на 25 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение от **6 % до 10 %** от итоговой цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 19.12.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 18.12.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ**
**С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ НА 5 %**

Организатор:
**Государственное опытное лесохозяйственное учреждение «Копыльский опытный лесхоз»**
*223927, Минская обл., г. Копыль, ул. Заозерная 2-я, 35, тел. +3751719 25219*

**Торги проводятся 17.12.2025**
**ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.**

**Трактор «БЕЛАРУС» 3022 ДЦ.1**
(2020 года выпуска, 277 332,85 BYN с НДС).

Окончание приема заявлений – **12.12.2025.**

Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**

УНП 600018703



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) проводит вторые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже **здания склада зерна 5616 кв. м,** расположенного по адресу:
**Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15,**
принадлежащего ОАО «Мозырский спиртоводочный завод» (Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016).

**Аукцион состоится 19.12.2025 в 13.00.**

Заявки принимаются **с 9.00 05.12.2025 по 18.12.2025 до 17.00.**

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на **www.bankrot.gov.by** либо на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** и по тел. +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна).

**Аукцион и прием заявок проходит по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Сморгоньагросервис», г. Сморгонь, ул. Тракторная, 64, УНП 500063122 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона** (одним лотом)
Адрес: **Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Тракторная, 85А, 85А/1**

**Складская база** (назначение зданий: здания специализир. складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) в составе: **склад запчастей с навесом** (174,4 кв. м, 443/С-207967), **склад ПТО** (516,1 кв. м, 443/С-16685, составные части и принадлежности: бордюр, площадка, два ограждения). ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,4476 га предоставлен на праве аренды (срок действия по 12.11.2074) для строительства и обслуживания зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: природная территория, подлежащая спец. охране (водоохран. зона)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 233 220,41 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 20 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.01.2026 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.01.2026 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**ДОПОЛНЕНИЕ к проектной декларации ООО «СМУ-87»,**
*опубликованной в газете «Звязда» 11.02.2025 г.,*
**по объекту «Возведение жилой застройки по ул. Мястровской в м-не Лебяжий г. Минск»**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по г/п с пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой предлагаются:

**15 (пятнадцать)** однокомнатных квартир **площадью от 33 до 39 кв. м включительно**, стоимость 1 кв. метра **от 6 336 до 7 500 белорусских рублей;**

**5 (пять)** однокомнатных квартир **площадью от 40 до 50 кв. м включительно**, стоимость 1 кв. метра **от 6 176 до 7 500 белорусских рублей;**

**2 (две)** двухкомнатных квартиры **площадью от 58 до 61 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 6 240 до 7 300 белорусских рублей;**

**7 (семь)** двухкомнатных квартир **площадью от 84 до 97 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 277 до 6 000 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой оплаты от даты, следующей за днем регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику пн.–пт. с 9.00 до 19.00, сб. с 10.00 до 16.00, вс. – выходной, тел. 375 (44) 711-33-00.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться с 9.00 рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящего дополнения в порядке живой очереди в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

УНП 193672656

В **суд Воложинского района Минской области** поступило заявление об объявлении умершим гражданина БОГИНО Евгения Геннадьевича, 24.06.1951 года рождения, уроженца д. Пугачи Воложинского района Минской области Республики Беларусь, зарегистрированного по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, д. Пугачи, ул. Центральная, д. 62, последнее известное место жительства: Минская обл., Воложинский р-н, д. Пугачи, ул. Центральная, д. 62.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающих сведениями о гражданине Богино Евгении Геннадьевиче, сообщить их суду Воложинского района Минской области в течение двух месяцев со дня опубликования объявления по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. Щербины, д. 31 или по телефону 8 (01772) 55465

ПЯЦІГОДКА РАЗВІЦЦЯ

# ЛАКАМАТЫВЫ РУХУ НАПЕРАД

## Нягледзячы на складанасці, развіццё Віцебскай вобласці ў пяцігодцы, якая завяршаецца, накіравана на фарміраванне моцнага рэгіёна і павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва

За апошнія гады ўдалося нармалізаваць сітуацыю ў прамысловым сектары, асобных галінах сельскай гаспадаркі, зрабіць рэгіён прывабным для інвестараў, значна павялічыць аб'ёмы экспарту тавараў і паслуг.

У паўночным рэгіёне пражывае каля 12 % жыхароў краіны. Вобласць фарміруе больш за 10 % экспарту тавараў рэспублікі, звыш 11 % аб'ёму прамысловай вытворчасці, каля 11 % прадукцыі сельскай гаспадаркі, больш за 9 % аптовага і рознічнага тавараабаротаў, інвестыцый у асноўны капітал, амаль 9 % валавога ўнутранага прадукту.

— За 2021—2024 гады ў апрацоўчай прамысловасці, якая з'яўляецца асноўным лакаматывам развіцця рэгіёна, аб'ёмы вытворчасці ў фактычных цэнах узраслі ў 1,7 раза, экспарт высокатэхналагічных тавараў — у 7,8 раза, — адзначыў **старшыня камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама Дзмітрый НАВАЦКІ**. — Больш за 58 % інвестыцый вобласці накіравана ў сферу вытворчасці. Забяспечаны рост намінальнай налічанай сярэднямесячнай зарплаты ў 1,8 раза, уласных даходаў бюджэту — у 2 разы.

Грашовыя даходы на душу насельніцтва вобласці павялічыліся з 671,9 руб. у 2020 годзе да 1159,2 руб. у 2024-м. Рэальныя наяўныя даходы насельніцтва выраслі на 14,3 %. Суадносіны намінальнай зарплаты па вобласці да сярэднерэспубліканскага ўзроўню павялічыліся з 82,7 % у 2022 годзе да 83,4 % — у студзені — кастрычніку 2025-га. Міжрэгіянальная дыферэнцыяцыя па ўзроўні аплаты працы скарацілася ў 18 раёнах вобласці.



ТАА «Лукомльскі кансервавы завод».




ДЗУП «Эльрост».

За чатыры гады вобласць спрацавала з ростам валавога рэгіянальнага прадукту (102,6 % да 2020 года), прамысловай вытворчасці (100,8 %), рознічнага і аптовага тавараабароту (112,5 % і ў 2,5 раза адпаведна), грамадскага харчавання (у 1,4 раза), пасажыраабароту, экспарту тавараў і паслуг у 2,7 і 2,2 раза адпаведна.

Валавы рэгіянальны прадукт на душу насельніцтва павялічыўся ў 1,9 раза з 10,4 тыс. руб. у 2020 годзе да 19,7 тыс. руб. у 2024-м, інвестыцыі ў асноўны капітал — у 1,5 раза з 2,5 тыс. руб. да 3,7 тыс. руб.

Восем з 13 галін апрацоўчай прамысловасці забяспечылі рост аб'ёмаў вытворчасці. Нарошчваецца аб'ём экспартных паставак. У сельскай гаспадарцы рост вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі ацэньваецца на ўзроўні 105 %. Да канца пяцігодкі плануецца пабудаваць больш за 1,7 млн кв. м жылля.

**Расце інвестыцыйная актыўнасць бізнесу. Доля інвестыцый у аб'ёме валавога рэгіянальнага прадукту павялічылася з 14,8 % у 2022 годзе да 19,6 % у студзені — кастрычніку 2025-га і перасягнула рэспубліканскі ўзровень. Тэмп прыросту інвестыцый штогод апярэджваў сярэднерэспубліканскае значэнне.**

У рэальным сектары эканомікі з 2021 года рэалізавана больш за 160 інвестыцыйных праектаў, з іх трэцяя частка — у малых і сярэдніх населеных пунктах. Створана больш за 2 тысячы працоўных месцаў.

У рамках ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» рэалізавана 17 інвестыцыйных праектаў, сярод якіх — вытворчасць харчовых араматызатараў ТАА «Скорпіа-кветка» ў Бешанковіцкім раёне, рыбный прадукцыі ТАА «Лукомльскі кансервавы завод» у Чашніцкім раёне, фруктовых і агародніцкіх сокаў ТАА «Арганічныя прадукты» ў Шаркаўшчынскім раёне, будаўніцтва цэха па перапрацоўцы малака і вытворчасці сыроў ДЗУП «Эльрост» у Гарадоцкім раёне. Асвоена 417,3 млн руб. інвестыцый у асноўны капітал. Створана 485 працоўных месцаў. Да канца 2025 года плануецца завяршыць рэалізацыю яшчэ васьмі праектаў.

З 2021 года прамысловымі прадпрыемствамі вобласці прыцягнута больш за 5,9 млрд руб. інвестыцый у асноўны капітал, або каля 1,2 млрд руб. у сярэднім за год. Пастаянна мадэрнізуецца вытворчасці, ідзе тэхнічнае пераўзбраенне прамысловага комплексу. Так, ЗУП «ВІК — здароўе жывёл» і ТАА «Белкаралін» увялі ў эксплуатацыю новыя вытворчасці, СТАА «Манулі Гідраўлікс Мануфактурынг Бел» асвоіла вытворчасць рукавоў высокага ціску. УП «Мёрскі мясакамбінат» завяршыла праект «Тэхнічная мадэрнізацыя халадзільнай камеры ў будынку забойнага ўчастка», ААТ «Аршанскі інструментальны завод» — праект «Арганізацыя вытворчасці сучаснага металарэзнага і дапаможнага інструмента з укараненнем інавацыйных тэхналагічных працэсаў». У філіяле «Аршанскі хлебазавод» ААТ «Віцебскхлебпрам» запусцілі лініі па вытворчасці мафінаў, замарозкі хлеба, вытворчасці жытнёва-пшанічнага подавага збожжа. Гэта дало магчымасць палепшыць структуру выпуску прамысловай прадукцыі ў частцы росту ў агульным аб'ёме вытворчасці долі галін, якія працуюць на мясцовых і высокатэхналагічных сыравінных рэсурсах.

— Ацэньваючы работу прамысловага комплексу ў бягучай пяцігодцы, можна вылучыць шэраг галін, якія з'яўляюцца драйверамі росту аб'ёмаў вытворчасці ў супастаўных умовах, — адзначыў Дзмітрый Навацкі. — Гэта металургічная вытворчасць, вытворчасць гатовых вырабаў, электраабсталявання і машын, вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры, іншых гатовых вырабаў, фармацэўтычнай прадукцыі.

Вобласць падтрымлівае знешнія гандлёва-эканамічныя адносіны больш як са 100 краінамі. Тройку асноўных партнёраў фарміруюць Расія, Кітай, Казахстан, трэцюю частку экспарту ў якія складаюць харчовыя тавары і сельскагаспадарчая сыравіна. Прадпрыемствы вобласці актыўна асвойваюць рынкі краін Блізкага Усходу і Паўднёва-Усходняй Азіі. У бягучым годзе забяспечаны рост экспартных паставак мясных кансерваў, сыру, лесаматэрыялаў, металапракату, лекавых прэпаратаў, прысадак да маслаў, тэлевізараў, мэблі. Трэціна прадукцыі, што экспартуецца (без уліку нафтапрадуктаў), адносіцца да высока- і сярэднетэхналагічнай.

Паток турыстаў, якія наведалі Віцебскую вобласць у 2024 годзе, у 1,7 раза перасягнуў паказчык 2020-га. Экспарт турыстычных паслуг вырас у 4,5 раза.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА.**
**Фота БелТА.**



# ІДЭІ, ПАДМАЦАВАНЫЯ ВЫТВОРЧАСЦЮ



### Для інавацыйнага развіцця неабходна сінхранізацыя навукова-даследчай дзейнасці і мадэрнізацыі рэальнага сектара

**Каб быць багатым, мала быць разумным. Яшчэ неабходна прадпрымальнасць. Насамрэч з інтэлектуальным складнікам у беларускай эканоміцы ўсё ў парадку. Ёсць дастаткова магутная навукова-даследчая база, добрыя інжынерныя школы. Ды і нашы спецыялісты вельмі кваліфікаваныя. Сістэма адукацыі забяспечвае ўзнаўленне і развіццё чалавечага капіталу. Але неяк не заладзілася ў нас з прадпрымальнасцю. Асабліва ў інавацыйных кірунках. Несумненна, ёсць паспяховыя кейсы. Але яны не дасягнулі той крытычнай масы, каб нашы распрацоўкі разрывалі сусветныя рынкі і станавіліся крыніцай дабрабыту карпарацый з беларускім капіталам ці хоць бы сумесным.**



Дзелавое асяроддзе — вадаём са сваімі асаблівасцямі: вірамі, акуламі... і мноствам іншых непрадказальных і зусім нечаканых непрыемнасцяў. Каб праціснуцца скрозь іх да берага поспеху, мала навігацыйных ведаў. Неабходны пэўны склад характару, заснаваны на смеласці, устойлівасці да рызык, развітой інтуіцыі, адвазе, хітрасці і нават проста шанцаванні. Магутныя прадуктовыя прарывы, як правіла, складаліся з сімбіёзу інтэлекту і камерцыйнага таленту.

Можна па-рознаму ставіцца да экстравагантных пасажаў Паўла Дурава. Але ён змог вывесці на арбіту некалькі магутных праектаў, у тым ліку знакаміты Telegram. Яму ўдалося пад свае інавацыі знайсці фінансаванне, вывесці бізнес-праект на рынак, развіваць яго, структураваць...

Але тэхналагічны складнік Паўлу Дураву забяспечвае яго брат Мікалай — таленавіты матэматык. Менавіта ён ператварае смелыя ідэі ў арыгінальныя матэматычныя алгарытмы. У цені майстра прэзентацый Стыва Джобса з Apple хаваўся Стыў Вазняк, інжынерны геній якога ператвараў фантазіі ў канкрэтныя вырабы.

Любы поспех у бізнесе суправаджаецца доўгімі цітрамі ўдзельнікаў камерцыйнай перамогі: фінансісты, аналітыкі, маркетолагі, інжынеры, тэхнолагі... і, самае галоўнае, каманда кіраўнікоў, якой атрымліваецца злучыць разнапланавыя кампетэнцыі пад дахам адной ідэі, паставіць усім удзельнікам інавацыйнай рэгаты выразныя заданні, ператварыць іх у каманду, якая зладжанымі дзеяннямі прывядзе яхту да перамогі.

У нас ёсць навукоўцы. А вось капітанаў, якія змаглі б стварыць каманду для гонак на апярэджанне, не хапае. А яны патрэбны. У адваротным выпадку на нашых прыгожых караблях будуць плаваць іншыя. І ўжо гэтым, у прынцыпе, займаюцца. Нярэдка даводзіцца чуць: ёсць у нас класныя вынаходкі. Сусветнага ўзроўню. На іх аснове вялікія заводы будуюцца. Напрыклад, вырабляюцца арыгінальныя прыборы. Толькі не ў Беларусі, а ў Кітаі.

З аднаго боку, радуе: калі КНР уклала вялікія інвестыцыі ў вытворчасць пад нашы распрацоўкі, значыць, нашы навукоўцы і даследчыкі знаходзяцца на высокім узроўні. Але ж крыўдна: чаму эканамічны эфект фарміруецца за мяжой?! Гэтаму ёсць тлумачэнне: асноўны рынак збыту — у Кітаі.

Праціснуцца на рынак Паўднёва-Усходняй Азіі з высокатэхналагічнай прадукцыяй — складаны квэст. Тэхналогіі там купляюць, а гатовую прадукцыю, па вялікім рахунку, — не. Гэта палітыка, накіраваная на тэхналагічнае лідарства, якая прадугледжвае максімальнае самазабеспячэнне ў інтэлектуальнай сферы.

Не выключаю: пабудаваць такое прадпрыемства ў Беларусі праблематычна з камерцыйнага пункту гледжання: патрабуюцца вялікія інвестыцыі, тэхналагічныя кампетэнцыі, ёсць рызыкі прадукцыі — ключавыя рынкі за мяжой. Але сумесныя прадпрыемствы ў рознай канфігурацыі ніхто не адмяняў. Іншае пытанне, што для гэтага неабходна вакол навуковага праекта выбудаваць бізнес-архітэктуру, каб было разуменне, як укараняць распрацоўку ў вытворчасць, на якіх магутнасцях, хто інвестар, як размяркоўвацца правы на інтэлектуальную ўласнасць...

Але інавацыйны бізнес — асобная сфера дзейнасці, якая патрабуе сваіх унікальных кампетэнцый, вопыту, інтуіцыі. Больш лагічна, каб гэтым займаліся прафесіяналы ў сваёй галіне. Навукоўцы, такімі, несумненна, не з'яўляюцца. Адсюль неабходна не проста сувязь бізнесу і навукі, а фарміраванне інфраструктуры для ўкаранення вынаходак, іх камерцыялізацыі, калі заўгодна. І не проста арганізацыі вытворчасці, а фарміравання бізнес-архітэктуры, стратэгіі, з бізнес-планам, разуменнем крыніц інвестыцый, рынкаў збыту... Асобны вялікі і складаны кавалак работы, які патрабуе немалых інавацыйных падыходаў і крэатыву.



**Інтэлект ШТУЧНЫ**







# ЭФЕКТЫЎНЫ МЕХАНІЗМ

### Урадам зацверджана Дзяржаўная праграма «Збалансаваны рынак працы» на 2026—2030 гады

**Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, паведамілі ў прэс-службе Савета Міністраў.**

Тут растлумачылі, што мэта дакумента — забеспячэнне эфектыўнай занятасці насельніцтва і задавальненне патрэбнасці эканомікі ў працоўных рэсурсах.

У Саўміне адзначылі, што рэалізацыя дзяржпраграмы ў чарговай пяцігодцы будзе накіравана на вырашэнне трох задач, у ліку якіх задзейнічанне ўнутраных працоўных рэсурсаў у краіне, прыцягненне замежнай рабочай сілы для задавальнення патрэб наймальнікаў і паляпшэнне ўмоў і аховы працы.

Дарэчы, аб'ём сродкаў на рэалізацыю дзяржпраграмы ў 2026 — 2030 гадах складзе 289,5 мільёна рублёў, асноўная частка з якіх будзе прадугледжана ў рэспубліканскім бюджэце — 288 мільёнаў рублёў, на мясцовыя бюджэты прыйдзецца 1,5 мільёна рублёў.




# НАВАЦЫІ Ў ПАДЫХОДАХ

### У Беларусі ўдакладнены парадак ажыццяўлення дзяржаўнага будаўнічага нагляду

**Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын.**

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, дакумент падрыхтаваны ў мэтах прывядзення нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць органаў Дзяржбуднагляду, у адпаведнасць з асобнымі ўказамі Прэзідэнта.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 6 чэрвеня 2025 г. № 227 «Аб павышэнні эфектыўнасці кантрольнай (наглядной) дзейнасці», пастановай удакладняюцца правы органаў Дзяржбуднагляду пры ажыццяўленні дзейнасці ў частцы доступу на аб'екты і атрымання ад удзельнікаў будаўніцтва неабходных дакументаў.

Згодна з Указам Прэзідэнта ад 11 жніўня 2025 г. № 301 «Аб будаўніцтве аб'ектаў сотавай сувязі», пералік аб'ектаў, на якіх не ажыццяўляецца дзяржаўны будаўнічы нагляд, дапоўнены аб'ектамі сотавай рухомай электрасувязі вышынёй да 27 метраў уключна.

Пры гэтым удакладняецца тэрміналогія і ўносіцца шэраг змяненняў юрыдычнага і рэдакцыйна-тэхнічнага характару.

Таксама ў мэтах спрашчэння працэдур у будаўніцтве з пераліку дакументаў, што прадстаўляюцца заказчыкам пры звароце за выдачай заключэння па пабудаваным аб'екце, выключаюцца копіі плацежных даручэнняў, якія пацвярджаюць пералік мэтавых адлічэнняў на ўтрыманне органаў Дзяржбуднагляду.

Пастанова ўступае ў сілу з 1 студзеня 2026 года.



# ПА АДЗІНЫХ ПРЫНЦЫПАХ

### Новы рэгламент упарадкаваў узгадненне павышэння адпускных цэн на спажывецкія тавары і сыравіну

**У Беларусі зацвердзілі рэгламент павышэння адпускных цэн на спажывецкія тавары і сыравіну. Сам па сабе прынцып коштавага рэгулявання застаўся нязменны. Але некалькі змяняецца алгарытм змены кошту ў большы бок. Цяпер адпаведнае рашэнне будзе прымацца Камісіяй па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў. Тлумачым, што і як.**

Алгарытм узгаднення павышэння цаны згодна з новым рэгламентам выглядае наступным чынам. Вытворца фарміруе пакет дакументаў. Акрамя заявы неабходныя дакументы, якія пацвярджаюць павышэнне адпускных цэн, тлумачальная запіска з абгрунтаваннем прычын павышэння, разлік адпускных цэн або інфармацыі аб сабекошце (фактычнай і планавай), улічваючы галіновыя асаблівасці. Гэтыя дакументы вытворца адпраўляе ў дзяржаўныя органы, якім ён падпарадкаваны або ўваходзіць у сістэму. Юрыдычныя асобы і ІП звяртаюцца ў аблвыканкамы або Мінскі гарвыканкам па месцы рэгістрацыі. Дзяржорганы аналізуюць мэтазгоднасць або немэтазгоднасць павышэння цэн, даюць адпаведнае заключэнне і падаюць хадайніцтва ў МАРГ аб разглядзе пытання на пасяджэнні Камісіі па пытаннях дзяржаўнага рэгулявання цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў, прычым тэрміны строга рэгламентаваны — пяць дзён.

Пасля атрымання поўнага пакета дакументаў МАРГ дае заключэнне аб мэтазгоднасці павышэння коштаў і накіроўвае матэрыялы ў Камісію. На гэта таксама адводзіцца пяць дзён. Камісія на працягу трох дзён павінна разгледзець пытанне. Аб рашэнні інфармуюцца адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання.

Акрамя таго, рэгламентам зацверджаны парадак прызнання страціўшымі сілу рашэнняў аб узгадненні адпускных цэн дзяржорганамі.

Важны момант: дзяржаўныя органы не маюць права ўносіць дакументы на разгляд Камісіі (вяртаюць іх вытворцам) у наступных выпадках:

- калі ў заяве вытворцы адсутнічае інфармацыя аб выкананых мерапрыемствах па зніжэнні выдаткаў і (або) дасягнутым эканамічным эфекце ад іх выканання (за апошні справаздачны перыяд);
- калі мінімальны кошт апошняй рэалізацыі тавару (сыравіны) на экспарт ніжэйшы за мінімальны кошт рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі;
- калі ўдзельная вага рэалізацыі тавару (сыравіны) на ўнутраны рынак у аб'ёме рэалізацыі дадзенага тавару (сыравіны) нязначная (менш за 10 %);
- калі вытворцам (пры ўзгадненні) не прадстаўлены дакументы і (або) звесткі, прадугледжаныя ў адпаведнасці з гэтым рэгламентам, альбо прадстаўлены няпоўныя даныя ў дакументах і (або) звестках;
- калі эканамічнае абгрунтаванне прапанаванай адпускной цаны на тавар (цэны на сыравіну) з'яўляецца недастатковым.

У агульным і цэлым алгарытм дзеянняў пры павышэнні цэн не зведаў ніякіх змен. Але некалькі змянілася роля МАРГ і Камісіі ў гэтым працэсе. Раней яны выконвалі кантралюючую функцыю, мелі права адмяніць рашэнне органаў дзяржаўнага кіравання аб павышэнні цэн. Цяпер гэты працэс стаў больш цэнтралізаваны. З аднаго боку, павялічыўся ланцужок прыняцця рашэння. З іншага — жорстка прапісаны тэрміны праходжання пакета дакументаў усіх інстанцый.



Яшчэ адзін важны момант — павышэнне празрыстасці. Прынцыпы цэнавага рэгулявання заканадаўча прапісаны, адпаведныя рэкамендацыі, якімі неабходна кіравацца пры адабрэнні павышэння коштаў, былі прадстаўлены органам дзяржкіравання. Але ў цэнаўтварэння шмат нюансаў. І кожны дзяржорган кіраваўся нейкімі сваімі ўяўленнямі па гэтым пытанні. У выніку ў кожным з іх сфарміраваліся свае прынцыпы, падыходы і практыка. Новы рэгламент парадкуе працэс, робіць яго аднастайным. І гэта ўраўноўвае ўсе суб'екты гаспадарання, бо вытворцы адной і той жа прадукцыі могуць уваходзіць у сістэму таго ці іншага міністэрства або ведамства, а могуць знаходзіцца ў статусе і бязведамаснай падпарадкаванасці. Адпаведна, і ў розных органах дзяржкіравання павінны былі ўзгадняць павышэнне коштаў. У адных атрымлівалася лягчэй, у іншых — наадварот. Нават пры працы па інструкцыі заўсёды прысутнічае суб'ектыўны фактар. Пры цэнтралізаваным падыходзе ён знікае. І ўсе вытворцы аказваюцца ў роўных правах у рамках цэнавага рэгулявання ва ўсіх дробязях і тонкасцях.

**Аляксей КЛІМАЎ.**

АНАЛІТЫКА

# ГРОШЫ ЁСЦЬ, АЛЕ ТРЭБА ІХ ПРЫЦЯГНУЦЬ

## У Беларусі існуе велізарны рэзерв выкарыстання прыватных інвестыцый

Наша краіна не вельмі багатая. Але далёка і не бедная. Прычым у немалой колькасці грамадзян у характары пераважае здаровы сялянскі менталітэт, які прадугледжвае як беражлівасць, так і цягу да назапашвання. Балазе, рост даходаў насельніцтва і ў намінальным, і ў рэальным выражэнні дазваляе людзям адкладаць. Летась норма назапашвання дасягнула гістарычнага максімуму за найноўшую гісторыю Беларусі і перавысіла 15 % ад грашовых даходаў насельніцтва. І гэтыя сродкі могуць стаць значнай крыніцай інвестыцый для рэальнага і інавацыйнага сектараў. Іншае пытанне, што рэальны сектар павінен сфарміраваць такія прапановы, ад якіх немагчыма будзе адмовіцца.

Крыху лічбаў, якія ў нашым выпадку з'яўляюцца далёка не сумнымі. Сукупныя грашовыя даходы беларусаў летась перавысілі 150 мільярдаў рублёў. Гэта і заработная плата, і сацыяльныя трансферты, і даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці і нерухомасці. І больш за 15 капеек з кожнага рубля летась мы адкладалі. У агульнай складанасці ў 2024-м зберажэнні насельніцтва прыраслі на 22,5 мільярда рублёў. Шмат гэта ці мала? Цалкам дастаткова, каб ажывіць беларускую эканоміку.

По даных Нацыянальнага банка ў мінулым годзе тэрміновыя дэпазіты насельніцтва перавысілі 10 мільярдаў рублёў. Прырост склаў каля 35 %, ці 3 мільярды ў грашовым эквіваленце. Вядома, часткова адкладзеныя сродкі беларусы захоўваюць на тых жа бягучых рахунках, якія таксама з'яўляюцца рэсурсным складнікам банкаўскага сектара і выступаюць крыніцай для крэдытавання эканомікі. Але нямала сродкаў знаходзяцца, так бы мовіць, на руках у тых ці іншых валютах. З пункту гледжання інвестыцый гэтыя рэсурсы хаваюць у сабе велізарны патэнцыял.



По даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта летась укладанні ў асноўны капітал склалі 47,3 мільярда рублёў. У рэальнага сектара маецца вялікі рэзерв для нарошчвання актыўнасці, калі ён навучыцца прыцягваць сродкі прыватных асоб.

Будзем аб'ектыўныя: прыватная інвестыцыйная экасістэма ў нас развіта вельмі слаба. Чаму? Вельмі складанае пытанне. Быццам бы нарматыўна-прававая база для развіцця гэтага кірунку ёсць. Магчыма, у нейкіх момантах яна не самая дасканалая, патрабуе дапрацоўкі. Але якой — дакладна сказаць ніхто не можа. Тыя ж паявыя інвестыцыйныя фонды ўжо нямала гадоў ёсць магчымасць ствараць. Але пакуль гэтым правам асабліва ніхто не скарыстаўся. А калі няма практыкі, адпаведна, пытанне ўдасканалення нарматыўна-прававой базы ператвараецца ў нейкі абстрактны працэс.

Беларуская валютна-фондавая біржа таксама сфарміравала вельмі сучасную інфраструктуру, якая дазваляе кампаніям прыцягваць фінансавыя рэсурсы на адкрытым рынку. Але нельга сказаць, каб беларускі бізнес — і дзяржаўны, і прыватны — у масавым парадку карыстаўся такой магчымасцю. Пляцоўкі для біржавога гандлю ёсць, а тавару на іх — карпаратыўных каштоўных папер — фактычна няма. Адно з самых распаўсюджаных тлумачэнняў: у Беларусі мала грошай, каб разгарнуць шырокую актыўнасць на фондавым рынку. Прыводзяць нават нарматывы: гандаль каштоўнымі паперамі актывізуецца ў краінах, у якіх ВУП на душу насельніцтва перавышае 10 тысяч долараў. Быццам бы эмпірычны вопыт дзясяткаў краін гэты тэзіс пацвярджае. Але ці так ужо актуальна такое сцвярджэнне сёння?



Яшчэ адносна нядаўна біржавы гандаль з'яўлялася доляй досыць заможных грамадзян, бо патрабаваў пэўных выдаткаў па доступе да таргоў. Сёння актыўна развіваюцца разнастайныя мабільныя дадаткі і лічбавыя рашэнні, якія працэс інвеставання робяць даступным і танным. Каб стаць удзельнікам фондавага рынку, зусім неабавязкова быць мільянерам. Можна рабіць зберажэнні ў тых ці іншых каштоўных паперах фактычна з любым прыбыткам. Нават вельмі сціплым. У беларускім выпадку ўзнікае яшчэ адно цалкам лагічнае пытанне: а калі грошай раптам стане больш, ці зможа гэты патэнцыял рэалізавацца, калі ёсць дэфіцыт прапановы?

Узнікае вялікае пытанне да рэальнага сектара. З аднаго боку, многія кампаніі скардзяцца на дэфіцыт фінансавых рэсурсаў для актыўнага развіцця. З іншага — і блізка не выкарыстоўваюць усе магчымасці, якімі яны валодаюць для прыцягнення капіталу. У грамадзян штогод фарміруецца залішняя ліквіднасць у мільярды рублёў. Застаецца толькі зрабіць такую прапанову, каб ад яе было немагчыма адмовіцца. Вядома, гэта патрабуе пэўных намаганняў, кампетэнцый. І, галоўнае, адкрытасці. Тавар на рознічным рынку (у тым ліку і каштоўныя паперы) патрабуе адпаведнай рэкламы, піяру, прасоўвання. Неабходна, каб у яго паверылі прагматычныя беларусы. А тут ужо можна казаць аб якасці інвестыцыйных праектаў, іх інавацыйнасці і прывабнасці. Вось з гэтым у нас ёсць пэўныя праблемы. Дарэчы, попыт на рынку, які адлюстроўвае грамадскую думку, з'яўляецца дадатковай экспертызай бізнес-плана і яго жыццяздольнасці. Скажам, калі ў вас нарадзілася ідэя пабудаваць сетку паркінгаў, але ніхто не хоча ўкладваць у ваш бізнес ні капейкі, то існуе вельмі значная небяспека, што вашы паслугі па часовым захоўванні аўтамабіляў нікому не патрэбны. У іх не верыць масавы інвестар, у тым ліку зыходзячы і са сваіх асабістых спажывецкіх пераваг.

У Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на перыяд 2026—2030 гадоў, у Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2040 года прапісана развіццё фондавага рынку. Ёсць надзея, што само жыццё прымусіць рэальны сектар пашыраць інструментарый прыцягнення фінансавых рэсурсаў. Магчымасці банкаўскага сектара, уласных сродкаў і бюджэту не бясконцыя, а развіццё неабходна як паветра. Прыйдзецца перабудоўваць свой светапогляд і пераконваць прыватных асоб, каб яны ўклалі сродкі ў той ці іншы праект.

**Аляксей КЛІМАЎ.**







## НОВЫ ГІСТАРЫЧНЫ МАКСІМУМ

### Золатавалютныя рэзервы Беларусі павялічыліся амаль да 14 мільярдаў долараў

По папярэдніх даных, ЗВР нашай краіны па стане на 1 снежня 2025 года склалі 13,9 мільярда долараў у эквіваленце. Такія звесткі прыводзіць Нацыянальны банк.

Варта адзначыць, што за месяц (з моманту апошняй ацэнкі) золатавалютныя рэзервы выраслі на 1,3 %, або 177,2 мільёна долараў.

Найбольшую долю ў структуры міжнародных рэзервовых актываў Беларусі займаюць актывы ў замежнай валюце і манетарнае золата. По даных рэгулятара, аб'ём замежнай валюты ў рэзервах па стане на 1 снежня складаў 5,2 мільярда долараў, паменшыўшыся за месяц на 125,9 мільёна, аб'ём манетарнага золата, наадварот, павялічыўся на 314,8 мільёна, дасягнуўшы паказчыка ў 7,2 мільярда долараў.

Нагадаем, што, згодна з мэтавымі паказчыкамі грашова-крэдытнай палітыкі, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў Беларусі на канец гэтага года павінен скласці не менш як 7,1 мільярда долараў. По факце ён ужо перавышаны амаль у два разы.

БУДЗЬ У КУРСЕ

## ДАСТУПНА СВАЁ

### Як выгадна купіць беларускае

У рамках крэдыту «На родныя тавары» ад Беларусбанка з пачатку года пададзена каля 140 тысяч заявак і заключана звыш 100 тысяч дагавораў на агульную суму больш за 570 мільёнаў рублёў.

— Гэта крэдытная лінія з'яўляецца выгадным фінансавым інструментам, які дазваляе не толькі лёгка і зручна набываць якасныя беларускія тавары, такім чынам зніжаючы фінансавую нагрузку на шараговых пакупнікоў, але і падтрымаць айчыннага вытворцу, — адзначае **намеснік старшыні праўлення Беларусбанка Святлана КАЖЭКІНА.**

З наступленнем зімы асабліва актуальнымі становяцца пакупкі, якія дапамагаюць забяспечыць камфортную тэмпературу ў нашым жыллі. У рамках крэдыту «На родныя тавары» даступны шэраг адпаведных тавараў, сярод якіх — электрычныя канвектарныя абагравальнікі, газавыя і пелетныя катлы, пелетныя гарэлкі і электрычныя катлы.

Усяго асартымент пад крэдытаванне ўключае больш чым 30 катэгорый прадукцыі ад амаль 200 беларускіх вытворцаў. У спісе — бытавая тэхніка, мэбля, металічныя і драўляныя дзверы, сантэхніка, плітка, ламінаваныя падлогавыя пакрыцці, аўтамабільныя шыны, веласіпеды, матацыклы і нават піяніна. Таксама ў крэдыт можна набыць камплекты для будаўніцтва драўляных дамоў, зборныя канструкцыі і вырабы, што прапаноўваюцца многімі лясгасамі краіны. Поўны пералік даступных тавараў можна знайсці на сайце гэтага фінансавага інстытута.

Падаць заяўку на крэдыт можна ва ўстановах банка, аднак значна зручней зрабіць гэта дыстанцыйна — праз інтэрнэт-банкінг, М-банкінг або на сайце.

Калі ў кліента ўжо адкрыта крэдытная лінія «На родныя тавары» і ён здзяйсняе куплю ў партнёра банка, паўторна звяртацца ў аддзяленне не трэба.

І яшчэ. Будзе нялішнім нагадаць, што сума крэдыту, які выдаецца аднаму атрымальніку, разлічваецца зыходзячы з яго плацежаздольнасці і можа складаць да 300 базавых велічынь — цяпер гэта 12,6 тысячы рублёў. А пры набыцці камплектаў драўляных дамоў, зборных збудаванняў і вырабаў гэта сума павялічваецца да 500 базавых велічынь (21 тысяча рублёў).

**Сяргей КУРКАЧ.**



# КУЗНЯ ПАТРЭБНЫХ КАДРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Юбілей — гэта заўсёды мітусня. Але мітусня прыемная, з гасцямі, падарункамі і віншаваннямі. Гэтымі днямі ў БДТУ вельмі ажыўлена — у ВНУ прыехалі старыя сябры і новыя партнёры з розных куткоў свету. Кіраўніцтва ўніверсітэта вырашыла сумясціць святочныя мерапрыемствы з дзелавымі і арганізавала «Тыдзень навукі, адукацыі і інавацый», прысвечаны 95-годдзю БДТУ. Падзяліць свята з калегамі, а заадно прыняць шэраг важных рашэнняў і падпісаць дакументы аб далейшым супрацоўніцтве ў Мінск прыбылі дэлегацыі з Расіі, Кітая і Азербайджана.



> У 2025 годзе ў БДТУ былі адкрыты дзве новыя спецыяльнасці — «Праектаванне і тэхналогія беспілотных авіяцыйных комплексаў» і «Хімічная тэхналогія энерганасычаных матэрыялаў і вырабаў». На спецыяльнасці «Палімерныя матэрыялы» адкрылася прафілізацыя «Тэхналогія скуры і футра».

## ГЕАГРАФІЯ ПАШЫРАЕЦЦА

Як расказаў **рэктар БДТУ Сяргей КАСПЯРОВІЧ**, універсітэт цесна супрацоўнічае з шэрагам замежных універсітэтаў па розных кірунках, у прыватнасці — па развіцці тэхналогій нафтаперапрацоўкі тонкіх хімічных тэхналогій і іншых.

— У рамках узаемадзеяння рэалізуюцца сумесныя навуковыя праекты, праекты мабільнасці вучоных і студэнтаў, а таксама шэраг сумесных адукацыйных праграм у такім фармацэ, як, да прыкладу, летнія школы, — расказаў кіраўнік ВНУ.

Ён канстатаваў, што геаграфія экспарту адукацыйных паслуг пашыраецца з кожным годам, і цяпер у БДТУ атрымліваюць адукацыю студэнты з больш чым 45 краін.

— Лідзіруюць у гэтай статыстыцы Расія і Кітай, — адзначае Сяргей Каспяровіч. — У нас вучыцца больш за 670 грамадзян РФ і КНР.

## НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ: СЁННЯ І Ў ПЕРСПЕКТЫВЕ

У 2025 годзе ў БДТУ былі адкрыты дзве новыя спецыяльнасці — «Праектаванне і тэхналогія беспілотных авіяцыйных комплексаў» і «Хімічная тэхналогія энерганасычаных матэрыялаў і вырабаў». На спецыяльнасці «Палімерныя матэрыялы» адкрылася прафілізацыя «Тэхналогія скуры і футра».

— Мы не толькі адкрываем новыя спецыяльнасці, — падзяліўся рэктар універсітэта, — але і развіваем базавыя напрамкі: лясная гаспадарка, хімічныя і нафтахімічныя тэхналогіі. Яны вельмі запатрабаваны ў сённяшніх абітурыентаў. Па-ранейшаму ў топе IT-тэхналогіі. Вельмі добра прайшоў набор на новую спецыяльнасць «Праектаванне і тэхналогія беспілотных авіяцыйных комплексаў».

У планах — адкрыць падрыхтоўку па спецыяльнасцях «Інжынерная эканоміка» і «Прамысловая робататэхніка». Мяркуем, што набор будзе адкрыты на 2027/28 навучальны год. Пакуль прапрацоўваем, наколькі гэтыя спецыяльнасці будуць запатрабаваны. Калі казаць пра больш далёкія перспектывы, то ў планах — падрыхтоўка спецыялістаў у сферы штучнага інтэлекту. Неабходны патэнцыял маецца.

## НОВАЯ ЯКАСЦЬ ІНЖЫНЕРНАЙ АДУКАЦЫІ

Сёлета абітурыентамі беларускіх ВНУ сталі каля 2,5 тысячы выпускнікоў інжынерных класаў. Гаворачы пра гэтую адукацыйную траекторыю, рэктар БДТУ адзначыў:

— Маё меркаванне: інжынерныя класы — гэта вельмі добры і перспектыўны прафарыентацыйны праект. Паводле тых звестак, якія маю, каля 70 % выпускнікоў профільных класаў паступілі менавіта на інжынерныя спецыяльнасці. Наш універсітэт выбралі 199 чалавек, якія аказаліся вельмі падрыхтаванымі абітурыентамі. У большасці сваёй яны паступалі на конкурснай аснове, хоць і мелі права на льготу. Ці трэба казаць пра тое, што сёння гэтыя маладыя людзі сталі ўжо моцнымі студэнтамі, а ў будучыні стануць моцнымі спецыялістамі.

## КАРЫСНЫ ПАДАРУНАК

2 снежня да свайго юбілею БДТУ атрымаў яшчэ адзін падарунак — там адкрылася сучасная вучэбная лабараторыя фармацэўтычных тэхналогій, створаная на базе кафедры біятэхналогіі пры падтрымцы і дапамозе прадпрыемства «Белмедпрэпараты».

У новай лабараторыі будуць праводзіцца заняткі па такіх профільных дысцыплінах, як «Тэхналогія гатовых лекавых сродкаў», «Кантроль якасці і сістэмы стандартызацыі. Арганізацыя вытворчасці па GMP», «Хімія і тэхналогія біялагічна актыўных рэчываў», а таксама практычная падрыхтоўка па спецыяльнасці «Тэхналогія лекавых прэпаратаў».

Лабараторыя аснашчана сучасным прыборным і тэхналагічным абсталяваннем, з дапамогай якога будучыя спецыялісты будуць адпрацоўваць практычныя навыкі ва ўмовах, максімальна набліжаных да вытворчых. І гэта забяспечыць паглыбленне студэнтаў у рэальныя працэсы фармацэўтычнай вытворчасці.

У перспектыве лабараторыя ўвойдзе ў склад Цэнтра кампетэнцый БДТУ, і яе рэсурсы можна будзе выкарыстоўваць для пашырэння прафесійных навыкаў навучэнцаў каледжаў.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота дадзена БДТУ.**

КОНКУРС

# СПАБОРНІЦТВЫ БУДУЧЫХ МАЙСТРОЎ

## У Санкт-Пецярбургу праходзіць спаборніцкая праграма фіналу чэмпіянату «Прафесіяналы»



> У маштабнай падзеі бяруць удзел больш за 5 тысяч навучэнцаў з розных краін свету. І сярод іх — найлепшыя прадстаўнікі сістэмы прафесійнай адукацыі Беларусі.

Наймацнейшых вызначаць у блоках кампетэнцый: вытворчасць і інжынерныя тэхналогіі, адукацыя і сэрвіс, якія ўключаюць 27 кампетэнцый асноўнай катэгорыі і 3 кампетэнцыі катэгорыі «юніёры». Месца правядзення — КВЦ «Экспафорум» і Аэрапорт «Пулкава».

Нашы юнакі спаборнічаюць па сучасных і запатрабаваных кампетэнцыях:
✓ дашкольная адукацыя;
✓ кандытарская справа;
✓ мантаж і абслугоўванне прамысловых робатаў;
✓ цырульніцкае мастацтва;
✓ сельскагаспадарчыя біятэхналогіі;
✓ такарныя работы на станках з лічбавым праграмным кіраваннем;
✓ і іншых высокатэхналагічных кірунках.

Удзел у чэмпіянаце — гэта не толькі дэманстрацыя высокага ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі, але і ўнікальная магчымасць абмяняцца вопытам, умацаваць міжнародныя сувязі і пазнаёміцца з самымі актуальнымі трэндамі ў свеце рабочых прафесій.


Центр Промышленной Оценки

**• Организация аукционов • Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ПК «Дорстрой». Гомельская обл., Гомельский р-н, Терешковичский с/с, аг. Терешковичи, ул. Центральная, д. 3 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Асфальтоукладчик на колесном ходу Bomag BF300P, 2013 г. в.,** рег. знак ЕВ-3 9187, зав. № 821891021002, инв. № 48. Местонахождение – г. Гомель, ул. Кореневское шоссе, 1а

**Начальная цена лота (без НДС) – 70 000,00 долл. США***
**Расчет по договору купли-продажи будет производиться в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты предмета торгов*

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) календарных** дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата полной стоимости объекта должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.01.2026 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются: **по 12.01.2026 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

# ЗВЫЧКА ШКОДНАЯ І НЕБЯСПЕЧНАЯ

**Анколагі расказалі, якія пухліны выклікае тытунь і ці можна іх выявіць на ранніх стадыях**



Колькасць пацыентаў з анказахворваннямі расце, але гэта агульная тэндэнцыя як у краінах Еўропы, так і ў многіх іншых. І звязана яна найперш з павялічэннем працягласці жыцця і старэннем насельніцтва (рак, як вядома, — захворванне пажылых людзей), а таксама з магчымасцямі сучаснай медыцыны выяўляць злаякасныя новаўтварэнні на ранніх стадыях. Захваральнасць на рак у нашай краіне складае 640 новых выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва.

Мноства анкалагічных захворванняў звязана з курэннем. Перш за ўсё гэта пухліны лёгкага, поласці рота і гартані, стрававода, мочапалавой сістэмы. Увогуле ж канцэрагены, якія атрымлівае чалавек пры курэнні, могуць уплываць на ўсе пухліны, якія толькі могуць быць, а адмова ад шкоднай звычкі ў значнай ступені зніжае нагрузку на арганізм. Калі пацыент з анкалагічнай хваробай працягвае курыць, вынік лячэння будзе нашмат горшы, а колькасць ускладненняў большая, чым калі б ён адмовіўся ад цыгарэт. Спецыялісты РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава расказалі, якімі сучаснымі метадамі сёння выяўляюць і лечаць рак лёгкага, мачавога пузыра, поласці рота і гартані.

## АНКАКІЛЕР № 1

У мужчын рак лёгкага ў нашай краіне займае другое месца па захваральнасці і першае —па смяротнасці. Абганяе яго толькі рак прастаты. Гэта цяжкае захворванне: аднагадовая лятальнасць пры яго выяўленні складае 70 %. Пакуль агульнапрызнанага спосабу скрынінгу раку лёгкага не існуе, але анколагі шукаюць спосабы выяўляць яго на ранніх стадыях.

— Мы правялі праект па вывучэнні эфектыўнасці нізкадозавай КТ для скрынінгу раку лёгкага, і ён паказаў, што менавіта прымяненне такога метаду ў групе рызыкі дазваляе якраз павысіць долю пацыентаў, выяўленых з ранняй стадыяй, — гаворыць **Аляксей КУРЧАНКОЎ, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі таракальнай паталогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, кандыдат медыцынскіх навук.** — Стандартна ж апошнія 3 гады, на жаль, рак лёгкага дыягнастуецца на трэцяй-чацвёртай стадыі ў 60 % нашых пацыентаў. Але прыкладна такая ж сітуацыя ва ўсім свеце.



Па захваральнасці на рак гэтай лакалізацыі наша краіна знаходзіцца на 14-м месцы ў Еўропе, а па смяротнасці — на 32-м.

— Гэта сведчыць, што ў нас, несумненна, ёсць поспехі ў лячэнні раку лёгкага. Па гэтым паказчыку нас апераджае толькі дзве краіны ў Еўропе — Іспанія і Францыя. Цяпер у нас праходзіць некалькі навуковых даследаванняў па лячэнні раку лёгкага ў трэцяй стадыі і па лячэнні з прымяненнем 3D-мадэлявання для выканання органазахоўных аперацый. Таксама шырока выкарыстоўваецца міні-інвазіўная хірургія, усё гэта паляпшае вынікі лячэння, — адзначае Аляксей Курчанкоў.

Як дадае **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сяргей ПАЛЯКОЎ**, ёсць яшчэ адзін паказчык, які сведчыць аб эфектыўнасці лячэння.



— У нас ёсць такое паняцце, як радыкальна пралечаныя пацыенты. Гэта значыць, пацыенты, якім, нягледзячы на стадыю — яна можа быць як першай, так і чацвёртай — удалося правесці поўны комплекс лячэння (або аперацыю, або аперацыю ў спалучэнні з хіміятэрапіяй, таргетнай, прамянёвай тэрапіяй). У 60 % выпадкаў яны маюць 5-гадовую выжывальнасць. Гэта той паказчык, на які арыентуюцца ўсе анколагі, і ён насамрэч вельмі добры, — падкрэсліваe Сяргей Палякоў.

## КУРЫЛЬШЧЫК РЫЗЫКУЕ НЕ ТОЛЬКІ ЛЁГКІМІ

Падчас курэння канцэрагены пранікаюць у арганізм чалавека праз ротавую поласць, лор-органы, потым ідуць у лёгкія, частка трапляе ў страўнік і кішэчнік, яны ўсмоктваюцца ў кроў і фільтруюцца праз ныркі. Выводзяцца гэтыя рэчывы пераважна з мачой, а значыць, уздзейнічаюць на ныркі, павялічваючы рызыку іх захваральнасці на рак. Але найбольшую небяспеку канцэрагены тояць для мачавога пузыра, бо канцэнтруюцца ў мачы і дастаткова доўга кантактуюць з яго эпітэліем.

— Па падліках эпідэміёлагаў, палова выпадкаў раку мачавога пузыра звязана з курэннем. Калі б усе людзі кінулі курыць у адзін момант, мы б на 50 % змаглі знізіць захваральнасць, — адзначае **загадчык лабараторыі анкаўралагічнай паталогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Аляксандр РАЛЕВІЧ.**



Рак мачавога пузыра дастаткова агрэсіўны і адносіцца да тых, якія няпроста вылечыць.

— Ён мае такі хранічны характар, які рэцыдывуе. Мы спрабуем лячыць органазахавальнымі метадамі, уздзейнічаць толькі на пухліну. Але пастаянны прыток канцэрагенаў, калі пацыент курыць, забяспечвае анкалагічны працэс у іншых месцах мачавога пузыра. І з'яўляюцца новыя пухліны, часта яшчэ больш агрэсіўныя, чым ранейшыя, якія вельмі складана кантраляваць, — дадае Аляксандр Ралевіч.

## НЕЗАЎВАЖНАЕ ВІДАВОЧНАЕ

Сапраўднай праблемай з'яўляюцца пухліны візуальных лакалізацый: губы, поласці рота, языка, дзясны, якія можна і адчуць, і ўбачыць. Але выяўляюцца яны ў палове выпадкаў на позніх стадыях. І такая праблема характэрна для ўсіх краін свету. У Беларусі па ініцыятыве анкалагаў у анкету для дыспансерызацыі ўключаны чатыры пытанні, адказы на якія дапамогуць выявіць анкалагічныя працэсы поласці рота на ранніх стадыях па характэрных сімптомах.

— Гэта наяўнасць незагойных язваў, белых, чырвоных, іншых плям у поласці рота, з'яўленне павялічаных лімфавузлоў на шыі, наяўнасць асіпласці, ахрыпласці голасу без адказу на супрацьзапаленчае лячэнне больш за тры месяцы, працяглая заложанасць носа з перыядычнымі крывацёкамі, выдзяленнямі слізі больш за тры месяцы без адказу на супрацьзапаленчае лячэнне. Гэтыя сімптомы могуць сведчыць аб злаякасных працэсах у поласці рота, шыі, гартані і носе, — расказвае **загадчык лабараторыі анкапаталогіі галавы і шыі з групай анкапаталогіі цэнтральнай нервовай сістэмы, доктар медыцынскіх навук, прафесар Жанна КАЛЯДЗІЧ.**



Многія захворванні, у тым ліку і некаторыя анкалагічныя, можна папярэдзіць. Адмова ад курэння — найлепшая прафілактыка злаякасных новаўтварэнняў, якую можа дазволіць сабе кожны, хто мае гэту шкодную звычку.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **23 декабря 2025 года** проводит **407-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Арендодатель имущества | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/сумма задатка (бел. руб.) | Наименование и целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 56 | **Районное коммунальное унитарное предприятие «Смолевичское ЖКХ», тел. 801776 27638** | г. Смолевичи, ул. Социалистическая, территория парка «Народного единства» | 3,0 | 0,3 БАВ за 1 кв. м | 4,22 | Открытая площадка под нестационарный торговый объект для размещения торгового автомата |
| 57 | **УП «Жильё», тел. 8 (0177) 768532** | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 11 | 57,2 | 1 | 268,41 | Помещение для размещения оборудования аттракцион «Автодром». **Срок аренды – 15 лет** |
| 58 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 11 | 179,0 | с 1 мая по 30 сентября – 0,15 БАВ в месяц за 1 кв. м; с 1 октября по 30 апреля – 1 БАВ в месяц за всю площадь | 125,99 | Асфальтированная открытая площадка для размещения и эксплуатации механизированного аттракциона. **Срок аренды – 15 лет** |
| 59 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 11 | 316,16 | с 1 мая по 30 сентября – 0,15 БАВ в месяц за 1 кв. м; с 1 октября по 30 апреля – 1 БАВ в месяц за всю площадь | 222,54 | Асфальтированная открытая площадка для размещения и эксплуатации аттракциона вида «Автодром». **Срок аренды – 15 лет** |
| 60 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 11 | 142,50 | с 1 мая по 30 сентября – 0,15 БАВ в месяц за 1 кв. м; с 1 октября по 30 апреля – 1 БАВ в месяц за всю площадь | 100,30 | Асфальтированная открытая площадка для размещения и эксплуатации аттракциона вида «Автодром». **Срок аренды – 15 лет** |
| 61 | | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр. Революции, 11 | 400,0 | с 1 мая по 30 сентября – 0,15 БАВ в месяц за 1 кв. м; с 1 октября по 30 апреля – 1 БАВ в месяц за всю площадь | 281,55 | Асфальтированная открытая площадка для размещения и эксплуатации аттракциона вида «Автодром». **Срок аренды – 15 лет** |

Договор аренды заключается сроком **на пять лет**, если иное не указано в настоящей информации.
Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22. Аукцион состоится **23 декабря 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 2 декабря 2025 г. по 18 декабря 2025 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 407 от 23.12.2025 по предмету аукциона № ___**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»), телефон для справок +375 (17) 360 42 22; Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by** (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»), телефон для справок +375 (17) 360 42 22




Неасабісты суб'ектыў

# БОЙКАЕ МЕСЦА

## Як даць рады гарлапанам у сацыяльных сетках?

У маёй універсітэцкай сяброўкі была калісьці любімая фраза, якую яна пераняла ад сваёй крычаўскай бабулі: «Стань на бойкім месцы, вочы вылупі, крычы ва ўсю глотку — заўсёды праў будзеш». Не тое што мы кіраваліся ёй па жыцці, хутчэй гэта была такая вобразная ацэнка дзеянняў людзей, якія нахабна, нахрапам, не разабраўшыся, лезлі са сваёй «праўдай» па галовах іншых.

У наш студэнцкі час падобныя дзеянні мелі абсалютна фізічнае выяўленне і ўсе шанцы атрымаць такія ж абсалютна фізічныя наступствы — нахабніку маглі ў адказ надаваць кухталёў, прычым у самым прамым сэнсе. Што, калі не адбівала ахвоту надалей паступаць падобным чынам, дык хоць мінімум давала разуменне, што за гэта можа быць а-та-та. Шчаслівыя былі часы, наіўныя былі людзі! Мы тады не здагадваліся, што хутка з'явіцца «бойкае месца», на якім можна колькі заўгодна і, лічы, беспакарана гарлапаніць літаральна на ўвесь свет.

Я, калі здагадаліся, пра сацыяльныя сеткі, да якіх прычыніліся сёння нават «самыя адсталыя слаі насельніцтва». У іх кожны, каму такая ідэя прыйдзе ў галаву, сам сабе рэпарцёр. «Рэпартажы» транслююцца ў адкрытым доступе, прычым іх аўтары часта нават не чулі аб такіх паняццях, як аб'ектыўнасць і праўдзівасць інфармацыі.

Вось, напрыклад, зусім нядаўна ў Бараўлянах здарылася абсалютна па-чалавечы бытавая гісторыя. Дзяўчынка гуляла ў сяброўкі, бацька прыехаў забраць яе дадому. Прыехаўшы ў патрэбны двор, ён убачыў на арэлях дзяцей і, не разгледзеўшы толкам у ранніх прыцемках, падумаў, што гэта яго дачка. Хуценька рушыў да малых (пэўна, кудысьці спяшаўся), дзверы ў машыне пакінуў адчыненыя, стаў дачку клікаць. Падышоўшы бліжэй, убачыў, што дзеці не тыя, дачкі там няма. Памыліўся, з кім не бывае. Але тут да яго выскачыла маці тых самых дзяцей: маўляў, чаго ты ад іх хочаш? Мужчына паспрабаваў растлумачыць, што проста абазнаўся, але дыялогу не атрымалася: кабета пагражала яму міліцыяй і тым, што здыме яго на тэлефон. Урэшце мужчына забраў дачку, якая, як высветлілася, гуляла з сяброўкай у кватэры, і паехаў дадому. Здавалася б, інцыдэнт вычарпаны. Аднак заклапочаная маці не супакоілася.

Яна пайшла ў міліцыю. Тут яе можна зразумець і нават падтрымаць, бо ўсе мы пра бяспеку сваіх дзяцей дбаем, а людзі ёсць усякія, і верыць на слова незнаёмцу, можа, і не варта. Але нашай «гераіні» не цярпелася ж яшчэ і запісаць «рэпартаж», прычым тут жа. І вось яна ўжо са спалоханым выглядам, прыглушаным голасам, нібы дзесьці побач сапраўды крадзецца маньяк, вяшчае ў Tik-Tok: «Маіх дзяцей хацелі ўкрасці. Нейкі мужчына хутка ішоў да іх па дзіцячай пляцоўцы, падазрона азіраўся, трымаў рукі ў кішэнях. А непадалёк стаяла яго машына з адчыненымі дзвярыма...» Карацей, жах. Маньяк у Бараўлянах!

І гэта было б нават смешна, але «гарачую навіну» з сацсеткі падхапілі і простыя карыстальнікі, і рэсурсы, аўтары якіх сядзяць за мяжой і як могуць стараюцца нагадзіць Беларусі. І пакуль той няўважлівы небарака давёз дачку дадому, яго ўжо на ўвесь свет праславілі як выкрадальніка дзяцей і маньяка, які дзейнічае ў сталіцы прама сярод цёмнага вечара, а міліцыя бяздзейнічае, таму нашы дзеці ў небяспецы.

Дарэчы, міліцыя вельмі хутка высветліла ўсе абставіны, устрывожаную маці-«рэпарцёра» супакоілі. Яна нават запісала яшчэ адзін ролік, дзе, як мне падаецца, крыху расчаравана расказвае пра тое, што памылілася. «Так атрымалася... Дадумкі, выдумкі... Але, я думаю, любая жанчына мяне зразумее...» — скрушна ўздыхаючы, гаворыць яна на камеру.

Не, шаноўная, не любая. Вас не зразумее, напрыклад, жонка таго мужчыны. Вас не зразумее кожная, у каго яшчэ ёсць уласнае крытычнае мысленне, а не толькі жаданне хайпануць на «гарачай навіне», прычым не задумваючыся нават, што ў гэтай навіне праўда, а што, мякка кажучы, не вельмі.

І каб жа гэта быў адзінкавы прыклад! У той жа Tik-Tok людзям з уразлівай псіхікай лепш зусім не заходзіць. Вось мамка абурана скардзіцца, што вымушана рабіць са сваім школьнікам урокі («Чаму яго ў школе не вучаць так, каб не трэба было тлумачыць?! Дармаеды-настаўнікі дарма атрымліваюць зарплату»). Вось яшчэ адна пакрыўджаная ў праведным гневе расказвае, што яе «ўзорную сям'ю» паставілі ў сацыяльна-небяспечнае становішча «толькі за тое, што былы муж здзейсніў правапарушэнне». Вось яшчэ адна самадзейная «экалагіня» ходзіць са спалоханым выглядам па беразе возера і вяшчае: «Паглядзіце, якая тут пена. І яна вельмі дзіўна пахне. Не, я ніза-вошта летам не пайду сюды купацца»...

Тысячы праглядаў, сотні каментарыяў і рэпостаў аўтарам «рэпартажаў» забяспечаны. Праўда, аб'ектыўнасць? Не, не чулі. Што з таго, што школьнік прагульвае ўсе факультатывы, на якіх тлумачаць тое, што не зразумеў на ўроках? Што «правапарушэнне» бацькі, якое стала падставай для асаблівай увагі да яго дзяцей, — ужыванне і збыт наркотыкаў? Што пена на беразе вадаёма — ад таго, што ў ім восенню гніюць водарасці, гэта натуральны працэс, які ніякай шкоды экалогіі не наносіць?..

ШМАТ сёння кажуць пра «лічбавую гігіену», пра тое, што не трэба верыць, давяраць усяму, што чытаеш і бачыш у віртуальнай прасторы. Але, здаецца, сёння варта гаварыць у гэтым плане не толькі пра карыстальнікаў, але і пра аўтараў непраўдзівага або неаб'ектыўнага кантэнту. А то атрымліваецца, што хтосьці дзеля хайпу выкладвае ролік (як у некалькіх узгаданых прыкладах), а тыя, хто пасля ўдакладняе або ўвогуле абвяргае інфармацыю, нібыта апраўдваюцца. А «рэпарцёру» за гэта што? А часцей за ўсё — нічога. Атрымліваецца, тое крычаўскае «крычы ва ўсю глотку — заўсёды праў будзеш» і тут спрацоўвае?

Ці ўсё ж такі і тут можна даць рады гарлапанам? Адлучыўшы ад «бойкага месца» (доступу да інтэрнэту), напрыклад. Хоць бы часова, бо, калі не ставіць нахабніка на месца, ён не супакоіцца. Прынамсі, у рэальным жыцці так. У рэальнасці з папраўкай на віртуальнасць, думаю, таксама.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Лепельпромшвеймебель»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2433 | Капитальное строение с инвентарным номером 230/С-14073 (назначение – Здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – Швейный цех, общая площадь – 1945,1 м.кв, составные части и принадлежности – Подвал, уборная, ограждение, четверо ворот, три калитки, два покрытия); Вентилятор, инв. № 399; Вентилятор, инв. № 322; Вентилятор ВЦ-5, инв. № 388; Вентилятор центробежный, инв. № 389; ГЕРАН ЛЮКС ПГУ-1-100, инв. № 949; ГЕРАН ПГУ-1-300, инв. № 950; ГЕРАН ПГУ-С-153, инв. № 951; Кран-балка, инв. № 329; Лебедка првод-электр С508, инв. № 403; Машина швейная Minerva, мод. 428-2 № 3407 + приспособление для светоотр. ленты 25 мм, инв. № 910; Механическая щетка, инв. № 575; Нож швейный, инв. № 448; Парогенератор Gold Eagle DL-7, инв. № 952; Печь СВЧ Горизонт 20MW800-1378, инв. № 2343; Печь СВЧ Горизонт 20MW800-1378, инв. № 2345; Плита газовая, инв. № 622; Плотер JETLINK-180 N, инв. № 923; Принтер HP, инв. № 686; СТЕГАЛЬНАЯ МАШИНА Machine tech 1-61 m, инв. № 827; Стол Gold Eagle DL-1068, инв. № 653; Тележка ТС, инв. № 429438; Факс, инв. № 3200; Швейная машина 876, инв. № 558; Швейная машина 852, инв. № 235; Швейная машина 852, инв. № 319; Швейная машина 852, инв. № 247; Швейная машина 852, инв. № 321; Швейная машина 852, инв. № 574; Швейная машина 852*5, инв. № 46; Швейная машина 852*5, инв. № 288; Швейная машина 852*5, инв. № 311; Швейная машина пуговичная, инв. № 599; Шкаф холодильный, инв. № 633; Электроплита, инв. № 634 | 175 651,74 | 17 565,17 | 8 782,59 |

В отношении лота проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 45 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 18.11.2025

